# Нашыя аўтары

**Арашонак Арцём** — паэт, празаік, перакладчык. Выдаў кнігу Скончыў Віцебскі дзяржаўны універсітэт. Нарадзіўся ў 1981 годзе ў Віцебску. Жыве ў Віцебску.

**Аўчыньнікава Ганна** — паэтка. Студэнтка Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэту імя Янкі Купалы. Нарадзілася ў 1986 годзе ў Гародні. Жыве ў Гародні.

**Бабкова Вольга** – літаратарка, гісторык, архівістка. Дасьледуе старажытныя акты XVI-XVII стст. Друкавалася ў «Нашай Ніве», «Літаратуры і мастацтве», «Архэ». Нарадзілася ў Менску ў 1961 годзе. Жыве ў Менску.

**Бельская Ірына** — паэтка. Лаўрэат паэтычнага конкурсу «Нашай Нівы», прысьвечанага Дню зямлі (2005), лаўрэат паэтычнага конкурсу Віцебскага аддзяленьня СБП, прысьвечанага 125-годдзю Я. Коласа і Я. Купалы (2007). Нарадзілася ў 1989 годзе ў вёсцы Чарневічы на Глыбоччыне. Жыве ў Наваполацку.

**Быкаў Васіль** — народны пісьменьнік Беларусі. Празаік, публіцыст. Лаўрэат шматлікіх дзяржаўных і міжнародных літаратурных прэміяў. Аўтар кніг «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца», «Знак бяды», «Кар'ер», «Сьцяна», «Пахаджане», «Доўгая дарога дадому» і інш. Нарадзіўся ў 1924 годзе ў вёсцы Бычкі на Ушаччыне. Памёр у 2003 годзе.

**Гарэцкі Гаўрыла** — грамадскі дзеяч, географ, геолаг, заснавальнік савецкай школы палеапатамалогіі. Аўтар шматлікіх манаграфій і кніг па геалогіі, эканоміцы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986). Нарадзіўся ў 1990 годзе ў вёсцы Багацькаўка на Мсьціслаўшчыне. Памёр у 1988 годзе

**Гілевіч Ніл** — народны паэт Беларусі. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Прафесар. Паэт, драматург, перакладчык, фальклярыст, літаратуразнаўца. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1980). Аўтар кніг «Песня ў дарогу», «Прадвесне ідзе па зямлі», «Перазовы», «Паэтыка беларускай народнай лірыкі», «Святлынь», «Родныя дзеці» і інш. Нарадзіўся ў 1931 годзе ў вёсцы Слабада на Лагойшчыне. Жыве ў Менску.

**Дранько-Майсюк Леанід** — паэт, празаік, эсэіст, перакладчык. Аўтар кніг «Вандроўнік», «Тут», «Над пляцам», «Акропаль», «Стомленасць Парыжам», «Гаспода» і інш. Нарадзіўся ў 1957 годзе ў Давыд-Гарадку. Жыве ў Менску.

**Дубатоўка** Валянцін – празаік, паэт, дасьледчык Аўтар кнігі «Архіпелаг Сапегаў». Нарадзіўся ў 1963 годзе ў вёсцы Дзярэчын на Зельвеншчыне. Жыве ў Гародні.

**Жуковіч Васіль** — паэт, празаік, перакладчык, крытык. Аўтар кніг «Паклон», «Крылатыя сябры», «Мелодыя сьвятла», «Як адна вясна...», «Твая місія», «Разняволенне» і інш. Нарадзіўся ў 1940 годзе ў вёсцы Забалацьце на Камянеччыне. Жыве ў Менску.

**Зуёнак Васіль** – паэт, перакладчык, літаратуразнаўца, крытык. Кандыдат філалагічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1982 г.). Аўтар кніг паэзіі «Вясёлы калаўрот», «Крэсіва», «Крутаяр», «Нача», «Вызначэнне», «Лета трывожных дажджоў» і інш. Нарадзіўся ў 1935 годзе ў вёсцы Мачулішча на Меншчыне. Жыве ў Менску.

**Калядка Сьвятлана –** літаратуразнаўца, крытык. Артыкулы друкаваліся ў часопісе «Роднае слова», тыднёвіку «ЛіМ», шматлікіх навуковых зборніках. Аўтар манаграфіі «Непрыручаная птушка Палесься: творчая індывідуальнасьць Яўгеніі Янішчыц». Нарадзілася ў 1971 годзе ў вёсцы Юкавічы на Івацэвіччыне. Жыве ў Менску.

**Капусьцінскі Рычард** —польскі пісьменьнік, публіцыст, журналіст. Аўтар кніг «Калі б уся Афрыка», «Яшчэ адзін дзень жыцьця», «Футбольная вайна», «Падарожжа з Герадотам» і інш. Нарадзіўся ў 1932 годзе ў Пінску.

**Купава Мікола** — мастак, публіцыст. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, экслібрысе ў тэхніках лінарыту, акварэлі, літаграфіі. Аформіў больш за 30 кніг, у тым творы К.Каганца, В.Каратынскага, Я.Купалы, Цёткі і інш. За афармленьне энцыклапедычнага даведніка «Францыск Ска-

рына і яго час» адзначаны дыпломам імя Ф.Скарыны і медалём Ф. Скарыны. Лаўрэат прэміі імя Т. Касьцюшкі. Нарадзіўся ў 1946 годзе ў г. Воршы. Жыве ў Менску.

**Лецка Яўген** — празаік, перакладчык, публіцыст, літаратуразнаўца. Аўтар кніг «Па цаліку», «Дарога ў два канцы», «Хараство і боль жыцця» і інш. Нарадзіўся ў 1944г. у в.Пабрэзьзе на Наваградчыне. Жыве ў Менску.

**Ліс Дар’я** – празаік, паэт, журналіст. Скончыла факультэт беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М. Танка. Творы друкаваліся ў часопісах «Куфэрак Віленшчыны», «Акно», у «Нашай ніве». Нарадзілася ў 1981 годзе ў вёсцы Залесьсе на Смаргоншчыне. Жыве там жа.

**Лютынскі Віктар** – гісторык, журналіст. Творы друкаваліся ў «Беларускай мінуўшчыне», «Нашай Ніве», «Культуры» і інш. Нарадзіўся ў 1963 годзе ў Воршы. Жыве ў Воршы.

**Мацяш Ніна** —паэтка, драматург, перакладчыца. Лаурэат прэміі імя А.Куляшова (1984 г. ). Аўтар кніг «Агонь», «Удзячнасць», «Прыручэнне вясны», «Поўны келіх», «Жнівень»,«Шчаслівай долю назаві...», «Перабіраю самацветы» і інш. Нарадзілася ў 1943 г. у в.Нівы на Бярозаўшчыне. Жыве ў Белаазёрску.

**Міхно Уладзімір** — празаік, публіцыст. Аўтар кніг «Горкі зефір» і інш. Нарадзіўся ў 1964 г. у в. Чэрцы на Лепельшчыне. Жыве на Лепельшчыне.

**Някляеў Уладзімір** — паэт, празаік, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (2000 г.). Аўтар кніг паэзіі «Адкрыццё», «Вынаходцы вятроў», «Наскрозь», «Прошча», «Так» і інш. Нарадзіўся ў 1946 годзе ў Смаргоні на Гарадзеншчыне. Жыве ў Менску.

**Салейчук Яўген** – перакладчык. Скончыў Брэсцкі педуніверсітэт. Нарадзіўся ў 1969 годзе ў Пінску. Жыве ў Пінску.

**Сільнова Людка (Людміла)** – паэт, публіцыст. Аўтар зборнікаў «Ластаўка ляціць...», «Рысасловы», «Агністыя дзьмухаўцы», «Зеленавокія воі і іх прыгажуні». Нарадзілася ў 1957 годзе ў г. Маладэчна. Жыве ў Менску.

**Сіўчыкаў Уладзімір** — паэт, празаік, публіцыст, перакладчык, драматург, мастак. Аўтар кніг «Гульня ў тастамант» і «Лісты да брата». Нарадзіўся ў 1958 г. у Жодзіна. Жыве ў Менску.

**Сыс Анатоль** – паэт. Аўтар кніг «Агмень», «Пан Лес», «Сыс». Нарадзіўся ў 1959 годзе ў вёсцы Гарошкаў пад Рэчыцаю. Памёр у 2005 годзе.

**Сьцяпан Уладзімір** — празаік, паэт, мастак. Аўтар кніг прозы «Вежа», «Сам-насам». Нарадзіўся ў 1958 годзе ў м. Касьцюкоўка на Гомельшчыне. Жыве ў Менску.

**Тарас Валянцін** — паэт, празаік, перакладчык, публіцыст. Аўтар кніг «Прощальные костры», «Дань времени», «Доверие», «Две тетради», «Размышление», «Пазіцыя», «На высьпе ўспамінаў» і інш. Нарадзіўся ў 1930 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

**Тарасаў Канстанцін** — празаік, публіцыст, журналіст. Аўтар кніг «День рассеяния», «В час Стрельца», «Память о легендах», «Странствие в тесном кругу», «Погоня на Грюнвальд» і інш. Нарадзіўся ў 1940 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

**Трафілаў Сяргей** – празаік, крытык. Студэнт 5 курса факультэту беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя Максіма Танка. Творы друкаваліся ў “Маладосці”. Фіналіст конкурсу маладых літаратараў імя Уладзіміра Караткевіча. Нарадзіўся ў 1985 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

**Фрыд Эрых** – паэт, празаік, перакладчык. Аўтар кніг “Германія”, “Вершы”, раману “Салдат і дзяўчына” і інш. Нарадзіўся ў 1921 годзе ў Вене, дзе жыў да вайны. Пасьля захопу Аўстрыі фашыстамі эміграваў разам з маці ў Лондан. Памёр у 1988 годзе.

**Хадановіч Андрэй** — паэт, перакладчык, літаратуразнаўца. Перакладае з ангельскай, французскай, польскай і ўкраінскай моваў. Аўтар кніг паэзіі «Лісты з-пад коўдры», «Старыя вершы», «From Belarus with love» і інш. Нарадзіўся ў 1973 годзе ў Менску. Жыве ў Менску.

**Шапран Сяргей** — журналіст, публіцыст. Аўтар шматлікіх інтэрв’ю з дзеячамі беларускай культуры, літаратуры, мастацтва, якія друкаваліся ў газетах «Знамя юности», «Советская молодежь» (Рыга), «Белорусская деловая газета» і інш. Нарадзіўся ў 1968 годзе ў Рызе. Жыве ў Менску.

# Contents

***POETRY***

**Nił Hilevič.** A Lucky Well. *Poems*
**Leanid Drańko-Majsiuk.** Fever. *A poem*
**Nina Maciaš.** The Light of a Mystery. *Poems*
**Andrej Chadanovič.** The Lake District School of Poetry. *Poems*
**Ludka Silnova.** On Kalinaú Bridge. *Poems*
**Hanna Aúčyńnikava.** Love Songs. *Poems*
**Darja Lis.** Eyes to Eyes. *Poems*

***PROSE***

**Vasil Bykaú.** That Spring... *An unfinished draft of a short story*
**Uładzimir Niaklajeú.** The Fiend. *A short story*
**Kanstancin Tarasaú.** The Silent Sounds of Solitude. *A short story*
**Uładzimir Ściapan.** Angels' Shadows. *Novellas*
**Uładzimir Michno.** You Have to Find the Ways. *A short story*
**Volha Babkova.** A House on the Underground River. *A short story*
**Valancin Dubatoúka.** The Boots. *A short story*

***DEBUT***

**Iryna Bielskaja.** To Warm My Soul. *Poems*

***TRANSLATIONS***

**Ryszard Kapuściński.** The Empire. *A novel (Part 1)*
**Erich Fried.** You and Me. *Poems*

***MEMOIRS***

**Valancin Taras.** The Cross of Repentment. *New chapters from* On the Island of Memories

***ARCHIVES***

**Siarhiej Šapran.** 'The KGB Has Information.' *From a book about Vasil Bykaú (Continued)*
**Haúryła Harecki.** 'In the Name of the Resplendent Images'. *Letters to relatives*

***MEMORIES***

**Mikoła Kupava.** Ages of Glory. *Notes on things distant and close*

***TRIPS***

**Uładzimir Siúčykaú.** Munchausen's Stone, *or a Pilgrimage to Kryúja*

***THE PAST***

**Viktar Lutynski.** Ink Murderers, *or Millions Agreed to Act as Informants.*

***MEMORY***

**Anatol Sys.** 'The Cleverest, the Most Honest…' *A speech at a public meeting to commemorate the victims of Stalin's repression, 1 November, 1987, Miensk*
"Love Us as You Have Created Us...' *Aleś Lipaj conversing with Anatol Sys*

***SCROLL***

**Aleh Abłažej.** Optipessimism. *Aphorisms*

***ESSAY***

**Vasil Zujonak.** Calling for the Word... *or Rhyme, a Resoundiing Friend*

***CRITICISM***

**Siarhiej Trafiłaú.** A Project of Revolution in Drama, *or Siarhiej Kavałoú's Five Representations*
**Śviatłana Kaladka.** 'On the Foundation of Assembled Impressions...' *Notes on a book of poems by Aksana Danilčyk*

***WORKSHOP***

**Jaúhien Lecka.** The Enduring National Spirit. *An Unknown Popular Poem Recorded in Navahradak District*

***BLITZ-CRIT***

Discussing *Yellow Colour of White Snow* by Aleś Astašonak

***DZIEJASŁOÚ'S STOCK***

New Books on **DZIEJASŁOÚ**'s Bookshelves

## Слова ад «Дзеяслова»

***Шаноўныя чытачы!***

На «Дзеяслоў» ***можна падпісацца***
ў любым паштовым аддзяленьні Беларусі.

**Наш індэкс – 74813** (для індывідуальных падпісчыкаў),
**– 748132** (для ведамаснай падпіскі).

Чытайце «Дзеяслоў» таксама ў Інтэрнэце: **www.dziejaslou.by**

Да ведама аўтараў:
рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Рэдакцыя не нясе адказнасьці
за выкладзеныя ў аўтарскіх тэкстах факты.

Пры перадруку
спасылка на «Дзеяслоў» абавязковая.

У «Дзеяслове» скарыстаныя фотаздымкі:
Сяргея Шапрана, Уладзіміра Крука, Глеба Лабадзенкі,
Віктара Стралкоўскага, Юрыя Дзядзінкіна, Анатоля Клешчука.